
ПА ДАРОГАХ
КАЗАК

УДК 821(100)-93-343.4
ББК 83.84(0)-445
П12

Серыя «Кніжкі дзеткам» заснавана ў 2018 годзе.
Мастак: *В. Чайчук*
Пераклад ажыццёўлены па выданні:
«По дорогам сказок», Русич, 2018.
Пераклад з рускай мовы: *А. Емяльянаў-Шыловіч, М. Адамчык*

П12 **Па дарогах казак** / перакл. з руск. мовы А. Емяльянаў-Шыловіч, М. Адамчык – Мінск: Харвест, 2018. – 128 с.: іл. – (Серыя «Кніжкі дзеткам»).

ISBN 978-985-18-4526-8.

Казкі самых вядомых казачнікаў свету доўгія гады не губляюць сваёй чароўнасці і працягваюць заставацца цікавымі для новых пакаленняў юных чытачоў, якія з хваляваннем назіраюць за ператварэннем гадкага качаняці ў прыгожага лебедзя, цешацца з выхадак хітрага ката ў ботах і дзівяцца знаходлівасці самага сумленнага чалавека на зямлі Мюнхгаўзэна.

УДК 821(100)-93-343.4
ББК 83.84(0)-445

ISBN 978-985-18-4526-8

© «Русич», 2018 г.
© Афармленне.
Пераклад з рускай мовы.
ТАА «Харвест», 2018 г.

ЗМЕСТ

Ганс Хрысціян Андэрсан. **КРЭСІВА** (*у перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*) 3
Шарль Перо. **ЧЫРВОНЫ КАПТУРОК** (*у перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*)..... 17
Ганс Хрысціян Андэрсан. **БРЫДКАЕ КАЧАНЯ** (*у перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*)..... 22
КРУМКАЧЫНЫ КАРОЛЬ *(народная казка ў перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*)..... 31
ХРАБРЫЯ ЗВЯРЫ *(народная казка ў перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*)..... 39
Браты Грым. **БЕЛАСНЕЖКА І ПУНСОВАКВЕЦІК** (*у перакл. М. Адамчыка*)..... 45
Шарль Перо. **КОТ У БОТАХ** (*у перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*)..... 55
Браты Грым. **ТРЫ МАЛЕНЬКІЯ ЛЕСАВІКІ** (*у перакл. М. Адамчыка*) 63
Ганс Хрысціян Андэрсан. **КУФАР-САМАЛЁТ** (*у перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*) 76
Ганс Хрысціян Андэрсан. **КАМІНАР І ПАСТУШКА** (*у перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*) 88
Вільгельм Гаўф. **ХАЛІФ-БУСЕЛ** (*у перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*)..... 96
Джордж Макдональд. **СЭРЦА ВЕЛІКАНА** (*у перакл. А. Емяльянава-Шыловіча*)..... 103
Распэ Рудольф Эрых, Бюргер Готфрыд Аўгуст.
ПРЫГОДЫ БАРОНА МЮНХГАЎЗЭНА. *(скарочана, у перакл. М. Адамчыка*) 114



HARVEST
www. harvest.minsk.by

6+

Літаратурна-мастацкае выданне
Серыя «Кніжкі дзеткам»

ПА ДАРОГАХ КАЗАК

Для малодшага школьнага ўзросту

Мастак: В. Чайчук
Пераклад: А. Емяльянаў-Шыловіч, М. Адамчык
Адказная за выпуск: М.Т. Шакур

Падпісана да друку 07.10.2018 г.
Фармат 60х90/8. Папера афсетная. Друк афсетны. Умоў.друк.арк. .
Улік. выд.арк. 17.7 . Наклад . Замова .

ТАА «Харвест». Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 1/17 ад 16.08.2013.
Вул. Скрыганава, д. 4А, адм.пам. 39, 220073, Рэспубліка Беларусь, г. Мінск.
E-mail рэдакцыі: harvest@anitex.by

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Пасведчанне аб ДРВВРДВ № 2/102 ад 01.04.2014.
Пр.Незалежнасці, 79, 220013, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь.



Ганс Хрысціян Андэрсан

КРЭСІВА

Ішоў салдат па дарозе: раз-два, раз-два! А насустрач яму старая ведзьма.

– Здароў, служба! – сказала яна. – Якая ў цябе добрая шабля! І ранец вялікі! А ці не хочаш грошай зарабіць, колькі тваёй душы заўгодна?

– Хачу! – кажа ваяка.

– Бачыш вунь тое дрэва? – пачала чарадзейка. – Унутры яно пустое. Я цябе абвяжу вяроўкай, а ты лезь на дрэва – там будзе дупло. Спускайся ўніз. Потым крыкнеш, я цябе выцягну.

– А навошта мне туды лезці? – спытаў салдат.

– Па грошы! – працягвала ведзьма. – Там, унізе, трое дзвярэй. Уваходзь у першыя. Пасярод пакоя ўбачыш куфар, а на





ім – сабаку. Вочы ў яго, як чайныя сподкі! Але ж ты не палохайся! Я дам табе сваю хустку, рассцялі яе на падлозе, а сам не марудзь – саджай сабаку на хустку, і нічога ён табе не зробіць. Адкрывай куфар ды бяры грошай уволю. Але ў гэтым куфры спрэс медзякі. Захочаш срэбра – ідзі ў другі пакой; там сабака з вачыма, як вялізныя талеркі! Але ж не палохайся. Саджай на хустку і награбай грошыкі. А захочаш, дык і золата дастанеш, колькі панесці здолееш, – варта толькі пайсці ў трэці пакой. Але ж у таго сабакі, што сядзіць на драўляным куфры, вочы, нібы млынавыя колы. Вось дык сабака! Злосны-злосны! Але і яго не бойся. Саджай на хустку і бяры золата, колькі ўлезе!

– Яно б і някепска! – кажа салдат. – Але што ты з мяне возьмеш, старая порхаўка?

– Прынясі мне толькі крэсіва. На яго забылася мая бабуля, калі спускалася туды апошнім разам.

– Абвязвай вяроўкай! – загадаў салдат.

– Гатова! – сказала ведзьма. – Бяры хустку!

Узлез ён на дрэва, спусціўся ў дупло і апынуўся ў вялікім калідоры, дзе гарэлі сотні лямпаў. Адчыніў першыя дзверы. Вох! І праўда – сабака з вачыма, як чайныя сподкі. Салдат пасадзіў яго на ведзьміну хустку і набраў поўныя кішэні медных манет. Закрыў куфар, пасадзіў сабаку назад і адправіўся ў суседні пакой. Вой-вой! А там сабака з вачыма, як вялізныя талеркі. Салдат і гэтага сабаку пасадзіў на хустку. Адчыніў куфар, а там срэбра – вочы разбягаюцца, вытрусіў ён медзякі з кішэняў і напхаў срэбрам. Вырашыў і ў трэці пакой завітаць. Цьху, каб ты спрах! Ну й звер! На драўляным куфры сядзеў сабака з вачыма, што млынавыя колы.

– Маё шанаванне! – сказаў салдат і ўзяў пад казырок.





Такога яшчэ не бачыў. Зрэшты, доўга на яго і не глядзеў, пасадзіў на хустку і адкрыў куфар. Бацюхны! Колькі золата! Павыкідаў радавы срэбра і так набіў кішэні, і ранец, і шапку, і боты золатам, што ледзь ногі мог перастаўляць. Нарэшце і ў яго грошы водзяцца! Пасадзіў ён сабаку на куфар, знайшоў крэсіва і крыкнуў:

– Гэй, д’яблава семя! Цягні!

Чарадзейка выцягнула яго наверх.

– Нашто табе крэсіва?

– Табе што за справа?! – агрызнулася ведзьма. – Набраў грошай – і добра! Ну, давай крэсіва!

– Ага, зараз жа! – не саступаў служывы. – Гавары, нашто яно табе, а то засяку!

– Не скажу! – заўпарцілася чартоўка.



Выхапіў наш ваяр шаблю, раз – і адсек ведзьме галаву, потым завязаў грошы ў хустку, ускінуў на плечы, сунуў крэсіва ў кішэнь і пакрочыў у горад.

Горад быў цудоўны! Салдат спыніўся ў самым дарагім заезным доме, выбраў сабе найлепшыя пакоі, заказаў улюбёныя стравы – цяпер ён быў багацеем! На другі дзень справіў сабе ладныя боты, новае адзенне. Сапраўдным панам зрабіўся, і расказалі яму пра ўсе дзівосы, што ў горадзе дзеяліся, і пра караля, і пра ягоную прывабную дачку.

– А як бы зірнуць на яе? – пацікавіўся дзяцюк.

– Гэта немагчыма! – папярэдзілі яго. – Яна жыве ў замку, за высокімі мурамі. Ніхто, апрача караля, не можа ўвайсці туды, бо яму прадраклі, што прынцэса





выйдзе замуж за звычайнага салдата, а манархі гэтага не любяць!

Вясёлае цяпер у служывага жыццё пайшло: хадзіў па тэатрах, ездзіў катацца ў каралеўскі сад, дапамагаў бедным. І правільна: хто-хто, а ён знаў, што значыць сядзець без капейкі! Пакуль было ў салдата золата, вадзіліся і сябры, і дзеўкі, але ж лёгка грош пражыць, а як яго нажыць. І засталося ў яго ў рэшце рэшт дзве манеткі. Давялося перабрацца з раскошных пакояў у малюсенькую каморку пад дахам; ніхто з былых прыяцеляў не наведваў – надта высока было да яго ўзбірацца.

Неяк увечары сядзеў салдат у сваім катушку, на дварэ сцямнела, а ў яго нават свечкі не было на што купіць. І згадаў ён пра маленькі агарак у крэсіве, якое ўзяў у сутарэнні, куды яго ведзьма спускала. Выняў крэсіва, толькі ўдарыў па крэмені, як дзверы адчыніліся, і перад ім з'явіўся сабака з вачыма, што чайныя сподкі, той самы, якога ён бачыў у сутарэнні.

– Чаго вы хочаце, гаспадар? – забрахаў позні госць.

– Вось дык гісторыя! – сказаў салдат. – А крэсіва чароўнае, выходзіць: цяпер я магу атрымаць усё, што пажадаю! Гэй ты! Знайдзі мне грошы! – крыкнуў ён сабаку!

Раз – і сабакі няма, два – ён тут як тут і ў ягоных зубах кашалёк з медзякамі! І сцяміў салдат, якое ў яго незвычайнае крэсіва. Варта ўдарыць па крэмені – з'яўляецца сабака, які сядзеў на куфры з медзякамі, ударыш двойчы – з'явіцца той, што сядзеў на срэбры, ударыш тройчы – і сабака з вачыма, як млынавыя колы, тут як тут.



Перабраўся наш герой ізноў у дарагія пакоі, стаў насіць франтаватае адзенне, а ягоныя былыя сябры хутка даведаліся пра гэта і надта ж палюбілі яго.

І задумаўся ён аднойчы: «Што за глупства – не бачыць прынцэсу! Такая прыгажуня кажуць, а што з гэтага? Увесь век сядзіць у сваім медным замку. Няўжо я так ніколі і не змагу хоць бы адным вокам яе згледзець? Ну, дзе маё крэсіва?» І ён ударыў па крэмені. У той жа момант з’явіўся сабака з вачыма, як чайныя сподкі.

– Праўда, ноч ужо, – прамовіў салдат, – але ж так мне захацелася хоць на імгненне ўбачыць прынцэсу!

Не паспеў служывы апамятацца, як сабака з’явіўся з прынцэсай, што спала ў яго на спіне. Дзяўчына

была неверагоднай прыгажосці: усякі заўважыў бы, што яна каралеўскай крыві. Салдат не ўтрымаўся і пацалаваў яе.

Сабака занёс прынцэсу назад, і яна за ранішняй гарбатай распавяла каралю з каралевай, што ўночы сніла дзіўны сон: быццам бы яна скакала вярхом на сабаку, а незнаёмец яе пацалаваў.

– Не можа быць! – здзівілася каралева.

Наступнае ночы да ложка прынцэсы прыставілі фрэйліну – яна павінна была даведацца, ці сон гэта быў.

А салдату зноў захацелася пабачыць прыўкрасную паненку. Уночы з'явіўся сабака, схапіў прынцэсу і паімчаўся з ёй, як віхор, але фрэйліна пусцілася наўздагон.

Яна прыкмеціла, што сабака разам з прынцэсай знік за дзвярыма аднаго вялікага дома, і падумала: «Цяпер я ведаю, дзе іх знайсці!» Фрэйліна ўзяла крэйду, накрэсліла на браме крыж і пайшла дамоў.



